Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

№ 2

ОРГАН АДДЗЕЛУ ПА ПРАЦЫ СЯРОД ЖАНЧЫН-
ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КОМУНІСТ. ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ-

СНЕЖАНЬ
1·9·2·4

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

ОРГАН АДДЗЕЛУ ПА ПРАЦЫ СЯРОД ЖАНЧЫН

Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай Партыі Беларусі.

№ 2. | СЬНЕЖАНЬ 1924 г. | № 2.

Зачем созываются с'езды крестьянок-общественниц.

В декабре соберутся и проведут свою работу с'езды тех крестьянок, которые избраны в советские, кооперативные органы, комитеты взаимопомощи и другие сельские организации. Проведение этих районных, окружных и Всебелорусского с'ездов крестьянок-общественниц—начало великого дела. Это начало широкого привлечения крестьянок к **деловому участию в устройстве жизни по новому,** как учил Ленин, как учит Коммунистическая партия.

Как буржуазия „освобождает" женщину.

В капиталистических странах тоже имеются организации, которые на словах, якобы, помогают вовлечению женщин в строительство жизни и освобождение ее.

Но чем занимаются эти буржуазные организации за-границей на деле? —Барыни-благотворительницы в этих организациях по-ханжески распределяют гроши между обнищавшими, обездоленными женщинами. Или эти барыни возятся над тем, чтобы помочь женщине бережливо вести свое бедное хозяйство. Иногда эти барыни помогают женщинам учить грамоту и заодно забивают их головы тяжелым туманом пресмыкательства перед богом и попом, капиталистом и барином.

Эти буржуазные организации кричат о равноправии женщины, об ее освобождении, но не договаривают самого важного, что ни это равноправие, ни освобождение женщины **невозможно, пока капиталисты везде командуют,** пока рабочие и все трудящиеся через революцию не возьмут власть в свои руки. Получается один **обман, затуманивание голов трудящихся женщин и грошовые подачки** из тех богатств, которые нажиты потом и кровью трудящихся. Такая буржуазная организация женщин только ведет к **еще более тяжелому и долгому закабалению трудящейся женщины.**

Женщина свободна только в Советской стране.

Только Коммунистическая партия за-границей начинает звать женщину на верный путь своего освобождения, звать на тот путь борьбы, которым пошли рабочие и крестьяне, работницы и крестьянки нашей страны.

Наша же Коммунистическая партия в советской стране уже многими делами показала, что она работницу и крестьянку действительно ведет к лучшей жизни.

Наш путь верен потому, что мы, коммунисты, зовем **самих** крестьянок дружно, организованно взяться за устройство жизни по новому своими руками. Мы не приходим сверху как господа, и не беремся освобождать крестьянку своими добрыми делами. Мы всегда говорим прямо каждой крестьянке: „Рабочий класс под руководством Коммунистической партии, ведя за собой крестьянство, разбил помещиков, буржуев, и всех бар. Крестьянка, **сама берись за работу своими руками, только ты сможешь устроить лучшую жизнь,** научиться общественной работе, стать грамотной, выдуть весь дым из головы, которым начадили попы и прочие затемнители. Рабочие, работницы, коммунисты более передовые, чем ты, **тебе помогут, иди за ними".**

Таким путем Коммунистическая партия и рабоче-крестьянская власть ведет женщину к действительному освобождению и к лучшей жизни. Советская страна—единственная на всей земле страна, где тысячи крестьян собираются обсуждать и учиться делу освобождения трудящихся от бедности, темноты и отсталости.

Крестьянка уже пошла по этому пути. Но только тронулась.

Зачем созываются с'езды кр. об—ц.

В Белоруссии **большим шагом вперед** будут эти с'езды крестьянок-общественниц. На одних только окружных и Всебелорусском с'ездах примут участие более 1250 крестьянок. Кроме того на районных с'ездах будет 5—6 тысяч крестьянок. Все эти крестьянки обсудят важнейшие вопросы деревни: работу сельсоветов, кресткомов, кооперации, охрану материнства и младенчества, земельный вопрос, культурная работа и др. На этих с'ездах крестьянки выработают, **как лучше крестьянке втянуться во все дело строительства жизни по новому, как учиться крестьянке на этом деле и как превратиться в полезного деятельного работника в деревне.**

Крестьянка Белоруссии должна готовиться к этим с'ездам и принять в них самое большее участие: подумать заранее над вопросами, посоветоваться по этим вопросам со своими знакомыми, выступать на с'ездах, внимательно слушать все доклады; все понять и запомнить, спрашивать, если неясно.

Пусть эти с'езды заденут, **расшевелят** каждую крестьянку. Пусть эти с'езды дадут понять каждой крестьянке, что улучшение хозяйства, укрепление смычки рабочих и крестьян и повышение культурного уровня и сознательности в нашей стране **невозможно** в полной мере, если во всю эту работу сама крестьянка не втянется. Коммунистическая партия и советская власть зовут к этому крестьянку и хотят ей в этом помочь.

А. Криницкий.

Деревенский быт и задачи крестьянки-общественницы.

Трудно нашу белорусскую деревню перестроить на новый лад. Крепко пустил в ней корни старый быт. При царе только и было забот о деревне, чтоб церквей понастроить, да казенок, а больница или школа была на последнем месте. Поэтому темна и невежественна наша деревня до сих пор.

При советской власти проснулось наше крестьянство, взялось за перестройку своей жизни. Есть в деревне молодые, крепкие силы, которые стремятся помочь советской власти искоренить остатки старого, прочистить дорогу новому.

Да вся беда в том, что глубоко в'елись в крестьянство обычаи, привычки, суеверия, которые внедрялись в него царским строем. Помещикам выгодно было, чтобы мужик был темен, неграмотен, пьян, суеверен, чтобы не догадался, кто сосет его кровь.

Церковь одурманивала крестьянку.

При такой жизни особенно темна была крестьянка. Даже в царские школы, где больше насчет молитв учили, девочек редко посылали. Так и росла крестьянка слепой. Только и свету было в ее темной трудовой жизни, что в церковь сходить. А церковь еще больше затуманивала разум. Замуж выходит—церковь, дети родятся—церковь, умирает кто—церковь, град прошел, дождя нет—церковь. Церковь умело внушала темной бабе чуть ли не с самого рождения, что баба—существо подневольное, — „жена да убоится мужа своего"; и бил ее муж, а жаловаться некуда. „Бог терпел и нам велел".

Веками так жила крестьянка, не мудрено, что теперь ей трудно выкарабкаться из этой темноты.

До сих пор крестьянка по старой привычке свои последние гроши попу тащит за крестины, да за молебны, свадьбы, до сих пор в школу дочку не пускает, до сих пор к бабкам, знахаркам, шептухам бегает вместо того, чтоб к доктору пойти или к акушерке. Сколько женщин так и себя и детей своих перепортили.

Нужно отречься от старого.

Пока не вылечишь деревни от всех этих привычек, до тех пор трудно будет перестраивать нашу деревню. Где тут говорить о новой жизни, когда самогон деревню заливает, когда жен бьют, когда старики молодежь не пускают в комсомол, когда вместо того, чтоб пойти лекцию агронома послушать или газету в избе-читальне почитать,— поклоны в церкви бьют, когда женщина дитя под кустом рожает, когда она к бабке бегает зубы заговаривает, когда дети мрут от собственной нашей глупости.

Чтоб поскорей изжить это все, надо крестьянке научиться по новому свою жизнь устроить, понять, что она тоже человек, что бить ее нельзя, что есть у нее защита, что и она, как и все, получила при советской власти права.

Крестьянка-общ.—борись за новый быт!

Наша партия коммунистическая добилась того, что теперь редко найдешь сельсовет или комитет взаимопомощи, где бы не было крестьянок. Конечно, в эти органы проходят самые сознательные, толковые женщины, которые являются новой общественной силой в деревне, стремящейся перестроить деревню.

Вот и надо, чтобы эти наши деревенские общественницы взялись за борьбу со старым бытом, который держит в кабале крестьянку. Надо посылать не только сыновей, но и девочек в школы, чтоб они не росли такими слепыми, как мать, чтоб не проклинали потом свою жизнь.

Да заодно общественница и сама обязана грамоте учиться и каждой крестьянке надо втолковать, что учиться никогда не поздно, что надо стараться развивать себя, чтобы уметь лучше устроить свою жизнь. Ведь с темной головой ничего не сделаешь.

Общественница должна во всем быть в первых рядах. Зайдет ли речь о детских яслях, первым агитатором за ясли должна быть общественница. Ее дело растолковать их значение, да научить, как взяться за их организацию, об'яснить, что нечего ждать, когда кто-то за нас все сделает.

Общественница первая должна своих детей в пионеры записать, а старших в комсомол пустить. Общественница первая обязана забыть дорогу к знахаркам да к бабкам. Есть у нас врачебные пункты, есть у нас акушерки—только к ним должна обращаться крестьянка. И здоровье лучше сохранит и карман будет цел.

Самогону общественница должна об'явить войну не на жизнь, а на смерть. Небось каждая крестьянка ее в этом поддержит. Не одна баба страдает от кулаков своего пьяного мужа, не одна плачет, глядя как сжигается на самогон трудовой хлеб. Выживем из деревни самогон, куда чище станет жить и драк будет меньше, и пожаров, и всяких гадостей, какие только пьяному на ум приходят.

Нужно освободиться от церковного обмана.

А больше всего должна взяться общественница за борьбу с религиозными предрассудками. Мало того, что церковь трудовые гроши вытягивает без пользы из крестьянских карманов. Она при этом не пускает нас, как следует взяться за стройку новой жизни. Невыгодно церкви, чтоб крестьянка грамотной была: перестанет баба в церковь ходить, детей крестить, с молебнами при засухе по полям ходить. Станет она вместо церкви в избу-читальню захаживать, на сходы, на лекции. Вот и старается церковь из последних сил держать в своих руках темную крестьянку. (Мужчина тот скорей от церкви отстал). „Как, мол, говорит поп, твое дитя некрещеное будет, как, мол, покойничков без отпевания хоронить, да свадьбу справлять без божеского благословения, да поповского напутствия". Общественница должна быть тут, как тут. И без попов, мол, обойдемся. Правда, стариков у нас не переделаешь, а молодежь охотно за новое берется. Устроить разок революционные крестины, или как в городе называют, „октябрины, устроить разок „красную свадьбу" без самогона, без попа, без драки, а с разумной беседой, с торжественным собранием—вот тебе и начало новых обычаев.

Поборов старое—создадим новое.

Общественница должна приложить свою руку в этом деле, пойти навстречу молодежи, вырвать крестьянку, крестьянскую молодежь из рук суеверия, предрассудков—это боевая задача общественницы.

Кропотливой, терпеливой работой не только в совете, комитете взаимопомощи или кооперации, но и просто у колодца, на завалинке, у соседней хаты общественница

обязана подтачивать старый быт, строить новый.

Только поборов вредные отстатки царского строя, поборов невежество среди крестьянок, сдвинув с привычного старого места уклады деревенской жизни,—сможет деревня стать на тот путь, который приведет ее к полному культурному и хозяйственному расцвету.

На общественницу-крестьянку советская власть в этом деле крепко надеется.

С. Шамардина.

Нужно ликвидировать неграмотность.

Одним из важнейших вопросов нашей работы в деревне является втягивание крестьянок в общественную жизнь страны. Необходимость проведения этого в жизнь учтена не только советскими работниками, но большинством крестьян, хотя они, правда, еще не полностью отказались от взглядов на крестьянку, как существо, созданное только для семьи, для домашнего хозяйства.

Наряду с ростом общей активности в деревне растет и активность крестьянки. У ней пробуждается постепенно интерес к общественной работе. Она становится другой. Семь лет советского строительства и, хотя незначительное, участие в нем крестьянки показало ей на практике, что она может помочь рабочим и крестьянам строить свое государство и тем самым помочь себе. Крестьянка не отмахивается теперь от общественной работы, как это было раньше. Это факты, говорящие за успех в этой работе.

Неграмотность—тормаз в общ. работе.

Но есть факты, которые являются тормазом в работе. Одним из крупных тормазов—это безграмотность крестьянки. Неразрывно с вопросом выдвижения крестьянок стоит этот вопрос. Сейчас у нас прошла кампания перевыборов советов, кресткомов и нарзаседателей. Много крестьянок оказалось избранными в эти учреждения. Но может ли крестьянка, будучи неграмотной, быть работоспособным членом совета, РИК или кресткома и т. д. Каждый член сельсовета, не говоря уже об обязанностях членов РИК, является деревенским выборным и несет известные обязанности по выполнению низовой советской работы: сбор налога, всевозможные оповещения граждан, раз'яснение декретов и постановлений и т. д. Не умея ни читать, ни писать, крестьянке трудно справиться с этой работой. Также трудно неграмотной крестьянке справиться с работой других органов, кресткомов, кооперации, нарзаседателей и т. д. А неграмотных крестьянок у нас 60 процентов; большой процент неграмотности падает на бедняцкие слои крестьянок.

Как ликвидировать неграмотность.

Ясна необходимость ликвидации неграмотности среди всего населения, но необходимость этой работы среди широких масс крестьянок еще острее. Сама крестьянка сознает это и тяга к грамоте и знанию у нее большая. Крестьянка заявляет об этом на всех сходах и в частной беседе. Ликвидацию неграмотности среди крестьянок нужно провести, как можно скорее. Необходимо в предстоящий зимний период использовать ликпункты, избы-читальни, школы и в первую очередь обучить грамоте крестьянок членов сельсоветов, кресткомов, нарзаседателей и др. выборных органов. Необходимо создать при делегатских собраниях маленькие ликпункты, исключительно для крестьянок, уже втянутых в общественную работу и подающих надежду, что и в будущем они будут работать. Следует привлечь к этому школьных работниц; в большинстве случаев они согласятся работать.

Ликвидация неграмотности—одна из неотложных задач и пока она не будет разрешена полностью, крестьянка не сможет участвовать активно в общественной жизни.

Громова-Пудаева.

Як жывуць і змагаюцца сяляне Заходняй Беларусі.

Заходняя Беларусь, якая засталася пад панаваньнем буржуазнай Польшчы, мае каля ста тысяч чатыракутных кілёмэтраў (кілёмэтр—менш вярсты) абшары; на гэтым абшары жыве каля двух мільёнаў беларусаў, не лічучы іншых жыхароў. Па абшары і ліку насельнікаў Заходняя Беларусь раўняецца палавіне Савецкай Беларусі, ці аднэй трацяй частцы этнографічнай Беларусі гэта знача усей тэрыторыі, на якой жывуць беларусы.

Дзякуючы таму, што у Заходняй Беларусі няма вялікай прамысловасьці, крупных фабрык і заводаў,—большая частка жыхарства займаецца сельскай гаспадаркай. Сяляне амаль не ўсе—беларусы.

Як-ж жывецца сялянам Заходняй Беларусі?

Панская зямельная „рэформа".

Яшчэ з часоў прыгону беларускі селянін быў мала „надзелены" зямлёй і адчуваў яе недахватак. Лепшую зямлю захапілі памешчыкі. Да рэволюцыі многа нашых малазямельных сялян выяжджала ў Амэрыку не знаходзіўшы працы і сродкаў для жыцьця у сваем краі. Жаданьне атрымаць зямліцы—галоўная жаданьне нашаго селяніна.

У сваім часе, калі польская буржуазія была настрашэна рэвалюцыяй, калі завярушылася і сялянства, калі Чырвоная армія стукалася у брамы Варшавы, польскі сойм (дзяржаўная дума) прыняў закон аб зямельнай рэформе. Загодна гэтага закону панскія маёнткі павінны былі зменшыцца да 300 моргаў кожны (морг—менш дзесяціны). Тым маёнткам, якія мелі прамысловыя прадпрыёмствы, ці навогул мелі культурна, інтэнсыўна пастаўлёную гаспадарку, пакідалася тысяча і больш моргаў. Пад апошнія падходзілі большая частка маёнткаў у Польшчы і „абразаць" прышлось бы вельмі мала. Рэшткa зямлі, абрэзаная ад маёнткаў, мела-бы быць разьмяркованай за плату ўласнікам (прымусовая парцэляцыя) для здавальненьня зямельнага голаду. Гэтым паны хацелі замыліць вочы сялянам і ўтрымать іх ад рэволюцыйнага руху.

Але прайшоў час, мінула апаска і гэтую нават „куцую" рэформу спыніла польская буржуазія. Закон не праводзіцца і ня будзе правадзіцца ў жыцьцё. Дзе-ж пан маючы ўладу згодзіцца добраахвотна зменшыць свой маёнтак? Зямлі сялянін Заходняй Беларусі не атрымаў.

Хто надзелёны зямлёй.

Нават тыя рэшткі запаснай зямлі, як быўшыя казеныя, частка царкоўнай і іншая не дасталіся селяніну. Гэтай зямлёй паны надзяляюць так званых „асаднікаў". Гэтыя асаднікі пасылаюцца сюды з Польшчы і шчодра надзяляюцца зямлёй, павялічваючы лік кулакоў. Большая частка асаднікаў на зямлі ніколі не працавала. Складаюцца яны з мяшчанскіх элемэнтаў, з адзначыўшыхся ў барацьбе з бальшавікамі быўшых легіянэраў і іншага, паслухмянага паном, элемэнта; ёсьць сярод іх ня мала краўцоў, парыкмахераў і гэтыму падобных „хлебаробаў". Пасыляліся асаднікі у Заходнюю Беларусь дзеля таго, каб пры іх дапамозе апалячываць беларусаў,—памагаць паліцыі і шпегам выяўляць тых, хто хоча змагацца з панамі.

Сялянін нават сваё страціў.

Яшчэ пры царскай ўладзе былі так званыя „сэрвітуты", гэта знача што ў некаторых месцох сяляне мелі права карыстаць супольна з памешчыкам пашай, выганам, вадапоем, лесам і іншае.

Карысталі з гэтага права сяляне дзесяткі гадоў, ад дзядоўскіх часоў. Нават царскія законы абаранялі гэтыя права сялян. Цяпер польскія паны знішчылі гэтае права і адабралі ад сялян сэрвітуты.

Дамагаюць селяніна падаткі.

Падаткі плаціць селянін большыя, як у старыя часы. Польскай буржуазіі трэба многа грошаў на ўтрыманьне многалічнай паліцыі і шпегаў польскай ахранкі,—вялікага войска, многа турмаў і рэшты ўстаноў, неабходных для утрыманьня ўлады паноў. А панскі ўрад не абкладае вялікімі падаткамі маёнткі фабрыкі і навогул крупную маёмасьць. Нават і тых падаткаў, якімі абложаны маёнткі, паны ня хочуць ўносіць сваечасова. Свой панскі ўрад іх ня вельмі да гэтага змушае. Напрыклад, замест чакаемых 333 мільёнаў падатку ад маёнткаў, на працягу $^3/_4$ году, паступіла падаткаў толькі 139 мільёнаў. Дык вось, увесь цяжар падаткаў і зложаны на сьпіну сялян ды рабочых. Селянін і рабочы такім чынам утры мліваe на свой кошт тыя ўстановы, якія больш усяго іх крыўдзяць і ўціскаюць.

Трэба адзначыць, што ў Заходняй Беларусі быў расійска-нямецкі фронт. Значныя абшары зьнішчаны, вёскі спалены, паля перакапаны вакопамі і апаясаны калючым дротам. Сяляне сядзяць у вакопных зямлянках, ня маюць сродкаў, ні леса, ні дапамогі на адбудаваньне.

Гвалты і зьдзекі над сялянамі.

Але ня толькі ў гэтым напрамку пакрыўджаны селянін Заходняй Беларусі. Паны прасьледваюць яго сялянскую беларускую мову і культуру. Школы беларускія, якія стварыліся там яшчэ з часоў нямецкай акупацыі, паны пазачынялі. Існуюць толькі польскія школы, праз якія паны маюць мэту апалячыць беларусаў. Але беларускі селянін трымаецца свайго, ня любіць ён культуры сваіх крыўдзіцеляй; большасьць сялян ня пасылае ў польскія школы сваіх дзяцей. А дзеля таго, што іншых школ няма, дык большая частка дзяцей зусім нідзе ня вучыцца.

Усякі беларускі рух спыняецца тэрорам, гвалтамі. Амаль без прычыны паліцыя хапае селяніна, арыштоўвае, трымае ў турме. Адбываюцца над ім ўсялякія зьдзекі; – бьюць яго у вакрутны спосаб, напрыклад: укладаюць паміж пальцаў алоўкі ці іншыя цьвёрдыя прадметы і сьціскаюць моцна рукі,— укладаюць пальцы паміж дзьвярэй, якія патым зачыняюць, заганяюць іголкі пад ногці, паляць пяткі гарачым жалезам і іншае. Гэта факты апісаныя нават польскімі газэтамі. Гэтым біцьцём змушаюць селяніна прызнацца да таго, што ён спачувае камуністам, што ён спачувае руху па вызваленьню беларускай культуры, — каб затым аддаць яго пад суд, каторы, варта адзначыць, карыстаецца з царскіх крымінальных законаў, толькі пераложаных на польскую мову.

Такім чынам, селянін Заходняй Беларусі жыве горай, як у царскія часы. Знаходзіцца ён пад падвойным соцыяльным (матар'яльнае становішча) і нацыянальным уціскам. Стогне ён пад непасільным цяжарам падаткаў,—ня мае зямлі, ня мае дзе вучыць дзяцей на сваёй роднай мове. Зьнімае перад ўсялякім шапку,—згінае сьпіну. Крыўдзіць яго і паліцыянт, і асаднік, і памешчык, і войт (валасны старшыня) і ўсялякі польскі чыноўнік, і ўсялякі „пан поляк".

Змагаецца селянін з панамі.

Страціў ён цярпеньне і пашоў змагацца з панамі. Крыецца сялянства ў лясох, арганізуе партызанскія атрады, якія робяць напады на маёнткі, нішчаць іх, паляць будынкі з быдлам і збожжам; нападаюць на асадніцкія гаспадаркі, нішчаць іх,—на паліцэйскія пастарункі, на паасобных паліцыянтаў,—на паязды, дзе аграбываюць багатых. Нападаюць на ксяндзоўскія памяшканьня „плебаніі" і караюць ксяндзоў за тое, што яны за адно з панамі, а сялянам ды рабочым толькі зацямняюць галовы.

У большасьці паліцыя й войска ня могуць злавіць партызанаў праз тое, што ім дапамагае сялянства, хавае іх, асьцерагае прад апаскай, паказвае пуціну, як скрыцца.

Селянін Заходняй Беларусі толькі яшчэ пачынае барацьбу. Многа яшчэ цяжкага прыдзецца яму перажыць, многа яшчэ спаткае гора на сваім шляху, але ўсё-ж, бяручы за прыклад селяніна Савецкай Беларусі, які перамог сваіх ворагаў і будуе сваё вольнае жыцьцё,—пры дапамозе рабочых і сялян усяе Польшчы—ён пераможа.

Я. Ліманоўскі.

ЛІТАРАТУРНА—МАСТАЦКІ

А Д Д З Е Л.

Міхасёва Марыля.

I.

Ішлі ў траіх і сьмяяліся. Кпілі з Прузыны, —Ева і Тэкля.

— Бачыш, ужо паўгода мінула, а Юзя—ні слова. Бальшавічкаю стала—куды-ж ёй да Прузыны. Раней, калі жыла з бацькамі, праца вала з цёмнага да цёмнага, чорнаю, бруднаю хадзіла, тады і Прузына была таварышкаю; а зараз—мо-ж бачылі на патрэце?—Пане мой, падчубарылася, адзелася, у шкураную жукетку, выстраілася... Дзеж нам да яе...

— Толькі клопату. Вялікая бяда! Я й вухам не вяду. Ня піша—ня трэба,—матнула рукою Прузына.

Відно было па яе твару, што сэрца пакрыта крыўдаю, што ў нутру Прузыны нездавольства да Юзі.

— Абяцала-ж, такіта, калі выязджала... Помніш?

Тэкля прыпомніла адзін выпадак і яшчэ раз перапрасіла таварышку:

— Помніш, Прузына?

Бязумоўна—Прузына помніла.

— Маўчы.

— Абы ў бальшавікі запісалася, раптам пераіначваецца.

— А ласьне яна ў бальшавікі пашла?

Тэкля ня верыла.

— Напэўна,—уверыла Ева...

Ішлі паціхай, азіраліся .

Пытаньнеў і адказаў—ня меншала. Цікавасьць дрэнчыла—Юзя ў пору папала на ўспамін. Чаму яна гэткая няўзьдзячная? Чаму не таварышкоўная?

Брала завісьць, зайздрасьць. Расла няпрыхільнасьць. Ева з Тэкляю падбівалі—Прузына раздражнялася. „Горад псуе людзей“—думала: „Юзя—найлепшы прыклад таму.

Каля Прузынінай хаты разышліся.

— Што-ж, мы простыя сялянкі, цёмныя.

З гэтаю думкаю ўвашла Прузына ў хату.

Абглядзела вакол, праверыла зіркам ў зеркала—ці-ж сапраўды нічога ня варта яна?

Нібы зеркала магло паказаць ёй яе нутро.

Адвярнулася няўпэўнэнай.

Паглядзела ў вакно.

Але стук у дзверы адцягнуў яе ўвагу.

Азірнулася.

— Табе пісьмо, Прузына. Маці дастала з пад фартуху зьмяты ліст і працягнула ў руцэ да Прузыны.

— Прачытай.

Прузына пасьпешна распакавала кабэрт, выняла спісаны кусочак паперы й пільна пачала чытаць уголас:

„Убачай, што доўга ня пісала; толькі прыехала, як мяне зразу паставілі на фабрыку працаваць. І вось—дзень працую, а вечарам іду ў клюбы, на сходы, часта ў тэятар. Няма хвілінкі вольнае. Завярцелася, як калясо ў машыне. Ня бачу, як дні мігаюць... Але, даражэнькая Прузынка, так цікава ўсё, так прыемна. Ня чуеш утомы. Вакола—свае людзі, рабочыя, работніцы, таварышчы. Адзін другому паддаём ахвоты і працуем ад шчырае душы, захопна...

Перарвала чытаньне і праказала да мацеры:

— Што вы думаеце, можа таму і праўда.

— Хто яе ведае,—сумелася старая.

— А мы, якраз, толькі ўспаміналі яе: прымха некая. Як быццам сэрца чула... Да сёньнешняга дню—на розум неўспадала, а гэта...

— Бывае, дачушка, пачуцьці сходзецца.

— Мабыць...

— Чытай жа далей.

Старая настаражылася, хапіла рукою за вуха, каб пільней выслухаць.

Прузына-ж, задаволеная, палішчая пісьмом Юзі, зарухала па хаце, занэрвавалася.

Памкнулася чытаць і ня сьцярпела, каб ня выказаць свайго настрою:

— А ўсё-ткі Юзя маладзец...

І ўтырылася ў пісьмо.

„Так, што мне сьвет адчыніўся, можна сказаць. Весела працаваць—дзе тая цяжар дзяецца. Ты, Прузына, доўга ня думай, а бяры... бяры...“

Прузына надсьвядома рашчытала далейшы сэнс сказу, нястрымалася і кінула мацеры:

— Я паеду, мама, да Юзі. Заве. бачыш...

— Дзе-ж заве? Ты выдумоўваеш, дзяўчына. Чытай, чытай.

Прузына не хацела дачытваць пісьма, палажыла яго на стол і ўскорыла хаду па хаце.

Тады маці падышла да стала, падняла пісьмо, павярцела ў руках і, ня стрымоўваючыся ад цікавасьці праведаць аўтэнтыку Юзіных слоў, павяліцельна сказала дачцэ:

— Та прачытай... Што, нямаеш сьцерпу?

Прузына пераняла з мацерыных рук пісьмо і на хаду зачытала:

„Я ўвесь час старалася падшукаць табе мейсца; гэта так сама перашкодзіла пісаць. А зараз, вось места ёсьць, знашла. Кідай усё і прыяжджай, не пакаешся. Вёска не прападзе, можна будзе вярнуцца назад, але па крайней меры паглядзіш, як людзі жывуць, як вядуць працу... Многае ўбачыш ня гэткім, як нам прыстаўлялася, як пра тое казалі"...

Яшчэ некалькі радкоў—Прузына не магла дачытаць.

— Бачыце...

Зрабіла два канцы хатаю і паставіла пытаньне рубам:

— Дык як, мама?

— А ты-б мо' хацела вось зараз, сёньня? Рухавая, порсткая..

Старая адышла да мыцельніку.

— Перад жнівом—саромейся казаць.

— А я думаю...

— Ды ты, ведаю, загарэлася... Пасьпееш нагалёкацца... Укруцець яшчэ ў гэты клубок...

Увайшоў з надворку бацька. Пільна прыслухаўся і гультайна запытаў:

— У чым справа?

— Пытай дачку...

— Прузына?

— Юзя ў горад заве, да сябе... Я думаю ехаць... Маці раней згаджалася, а цяпер, вось, перашкаджае...

Бацька некалькі хвілін падумаў. Маці скарыстала і адсекла:

— Прападзе паехаўшы. Думаеш, на людзі выйдзе? Вунь бегае Гершунава дачка, як цюцька гаўкае па сяле—тое й з яе выдзе.

— Не палохайся...

Бацька выказаў у гэтым слове свае адносіны да пытаньня і змоўк.

А Прузына набралася сьмеласьці і рашуча заявіла:

— Як сабе хочаце, я паеду.

— Што ты, самавольніца...

Пад вакном пачуўся голас Евы:

— Ты яшчэ, Прузына, не гатова?

Прузына адчыніла вакно:

— Зараз.

А маці перабіла з лёгкай злосьцю ў голасе:

— Прузына, вунь, у прочкі зьбіраецца.

— Як? Што вы жартуеце?

— Пісьмо Юзя прыслала.

Ева саскочыла з лаўкі і хутка ўбегла ў хату. Закідала пытаньнямі Прузыну і нарэшце стала ўгаварваць мацеру—пусьціць Прузыну ў горад.

II

Праз тыдзень Прузына выехала да Юзі. З натхненьнем перамарыла дарогу. Ні думкі сумненьня, ні каліва разуверра. Што і як стрэне яе горад—не цікавіла. Юзя—забірала ў сабе ўсе яе думкі, усе надзеі. Цугам, чарадою прайходзілі вобразы спатканьня, знаёмства з новым местам, з новаю працаю, з людзьмі. Праглася скараціць час і дарогу, як найхуччэй апынуцца каля мэты...

Шарым ранкам падвода ў'ехала на брукаваныя вуліцы. Дамы-грамады сьціснулі яе з абудвых бакоў. Наляцеў гук і сьвіст гарадзкога жыцьця. Дзе і што тая вуліца, той дом, у якім жыве Юзя?

— Завязеце мяне на гэты адрас.

Фурман прачытаў пісульку і, нічога не сказаўшы, хвасянуў каня. Некалькі дамоў прамінулі напрамік, пасьля завярнулі направа; праехалі і ўзялі ўлева.

Дзе-ж той дом, ці хутка?

Падвода спынілася каля двухпаверхавага дзеравянага будынку.

Прузына прыгледзелася на лічбу—тая, што Юзя адзначыла ў пісьме. Тут... зьлезла і пакіравала ў дзьверы. Кранула клямкі — раптам хтось адчыніў:

— Я ўгледзяла праз вакно.

Юзя працягнула таварышцы руку і ўхмыльнулася.

Прузына намерылася пацалавацца, але сумелася. Юзя паказалася гэткай, што не хапіла сьмеласьці. Ці ацэніць яе пачуцьцё прыязьні? Здаецца, Юзя стала недаступнаю: стройная, як хвоя, з копкаю падстрыжаных кос, у мужчынскай кашульцы па пояс, у боціках; хвацкія размахі рук, рашучая міна, бойкі пагляд, адрывістыя сказы—што ў ёй хаваецца? Ці яна запрашала ехаць?

— Хадзем, вып'еш гарбаты і я цябе завяду на фабрыку, дзе ты рабіць меш.

— Скажы, маеш, ахвоту?

Яны вайшлі ў Юзін пакоік. Прузына разьдзелася.

— Вось, пі. Юзя прысунула таварышцы гарбатнік, кавалак хлеба, агрызак сыру.

— Ты зараз на работу?—запытала Прузына і агледзела пакой: у адно вакно, не

абсталяваны, няпрыветны, але прыбраны. Павеяла беднасьцю, сумам.

— Гэта твая хата?

— Мая.

— Табе нудна аднэй?

— Мне? Я дома амаль-што й не сяджу: вось зараз гудок на работу, а пасьля работы—на курсы, у клюб, на сходы—пісала-ж табе...

Прузына ўвішна выпіла шклянку гарбаты і запрапанавала Юзі:

— Хадзем на фабрыку!

— Цікавішся?

Адзеліся і вышлі.

Новыя нябачаныя абставіны, сьвежасьць уражаньнеў—глушылі ў Прузыны ахвоту казаць што-кольвечы. Пад'язджаючы к дому, думала многае-многае паведаць, а цяпер—здавалася лішнім. Кожная рэч, кожны рух, кожны гук адцягаў Прузыніну ўвагу, перабіраў насьпеўшыя да выказу думкі.

Да фабрыкі, звыш вярсты дарогі, толькі некалькімі словамі перамовіліся—а то маўчалі. Каля брамы—Прузына сумелася і запытала Юзю:

— Гэтыя людзі; вось, усе тут працуюць?

— Так.

Прайшлі двор, ачуліся ў майстэрнях.

Шум машын, дзесяткі адналькових махаў, бегатня, нэрвовасьць, нясупынны рух. Вось-вось пераадзелася Юзя, адышлася ад яе, стала ў шэраг і як ня было яе. Дзе той парадак, дзе дагляд?

Праз хвілін дзесяць Юзя падбегла да яе і падвяла к сталу, тлумачачы асобныя часткі працы, паказваючы на майстра, на машыны.

Прузыніны вочы разьбягаліся, сэрца неспакоілася і разам з гэтым завіравала хаценьне хоць у гэту-ж хвіліну стаць на работу і зацяжна аддацца ёй. Ня думала, што не справіцца, ня бачыла ніякіх труднасьцяў, не баялася цяжару. А як было дома, у вёсцы?

Цешыла гармоннасьць, наладжанасьць, супольнасьць. Як не паглядзі—уздоўж сталу—людзі, людзі.

Вёска, бацькі, таварышкі—адышлі ўдаль, зацягнуліся тулям забыўчывасьці.

„Да дзіва, што Юзя так зьмянілася! Або фабрыка ня меняе людзей? Даль-бог, тут усё-усенькае іначай, асабіста, выдатна ад таго, што мне даводзілася бачыць".

Перад Прузынінымі вачмі праходзіла вырабчасьць. Спрытна перадавалася з рук у рукі. У баку зьбівалі скрынкі, каля дзьвярэй высовалі дошкі, з кутка ў куток бегалі-бегалі.

Прузына дваілася ў думках ды жаданьнях: ці прывыкне тут працаваць? Ні адвярнуцца—так і сачы.

Да абеду—сядзела пры Юзі, на мурзатым паломаным зэдліку; баялася яе адарваць ад працы—пакідала гутарку на вечар, у час абеднага перарыву.

А вышлі з заводу—не гаварыла нічога, толькі падганяла таварышку хуччэй паабедаць і варочацца на фабрыку.

— Сапачынь пайдзі, бо вечарам я цябе павяду ў клюб.

Радзіла Юзя.

Прузына не паслухала і праседзела ў фабрыцы да канца работы.

І ўжо йдучы дамоў з Юзею казала ёй:

— А цікава на фабрыцы. Толькі, як будзе прывыкнуць мне да работы! З табою гэта трудна было?

— Цудная, дзень, другі і асвойтаешся з усім. Пазнаёмішся з людзьмі... Калі хочаш, я сёньня цябе з некалькімі хлопцамі пазнаёмлю.

Хацелася і было ніякавата.

— Куды-ж мы пойдам?

— На пасяджэньне ячэйкі. Вось папьём гарбаты і вернамся. Адбываць мецца пасяджэньне ў фабрычным клюбе... Добра, Прузына?

Пэўна, было добра, хоць Прузына адчувала некую няёмкасьць, ціхую апаску. Зразу на ячэйку? А далей?

Успомніла мацеру і таварышак; успомніла тых комуністак, з якімі сварылася ня так даўно на сходзе вясковых кабет... А можа каторая з іх якраз і стрэнецца ёй?

— Ці-ж можна мне йсьці на пасяджэньне ячэйкі?—запытала Прузына ўжо папіўшы гарбаты.

— Пасяджэньне адчынетае. Пацікавішся.

Было цікава—не ўтаіць—Прузына не адмовілася пайсьці. Як усё ў іх водзіцца? „Бач, і Юзя цалкам аддалася бальшавіком. Няўжо й мяне ўвядзе"?

Сумлевалася й перажывала нявыразна—няпэўнае становішча; адчувала ні то баязьлівасьць, ні то казлытную нерашучасьць.

Клюб, бальшавікі, ячэйка—нясьліся папераду ў вобразах дзіўных і няясных.

І калі зыркая электрыка ў вокнах вялікага будынку на фабрычным двары абвясьціла аб месту пасяджэньня ячэйкі, Прузына сумелася і ўздрыганула ўсёю істотаю:

— Гэтта?

— Тут.

Увайшлі. Вялікая саля. Плякаты. Патрэты. Надпісы. Поўна людзей. Шум. Гутаркі. А пасьля—адчыненьне пасяджэньня. Ціш. Павестка: 1) *Вытворчасьці працы* і 2) *Шэфства над вёскаю.*

Пашлі прамовы, спрэчкі. Выступіла Юзя.

І Прузына, прапусьціўшы ўсіх гутарку, прыслухалася да таварышкі; кожнае слова хапала наляту—дзівілася сьмеласьці Юзінай. І асьцярожна, асьцярожна, з няўверанасьцю дазваляла чапіць думкі: ці я буду гэткай?

І зусім незаўважна дзеля сябе, калі хтось з места папярэчыў Юзі, адказала:

— Вы вёскі ня ведаеце.

Некалькі чалавек азірнуліся на Прузыну, але яна не сканфузілася ні званьня.

Юзя адобрыла таварышчын выгук і пахваліла Прузыну...

Прасядзелі цэлых тры гадзіны—Прузына захапілася.

III.

На заўтра Прузына пашла працаваць. Ёй далі чорную работу. Паставілі наводдаль ад Юзі, пры машыне. Майстар расказаў, як абыходзіцца з таварам, ад каго браць і каму перадаваць.

Было ня ёмка—не наладжана. Папробавала—і рукі хадзілі зусім ня так, як у майстра. Тавар выпадаў з рук; некалькі раз пачула з права—„давайце". Чырванела, прыкусвала губы, саромелася. Крыўдзілася на сваю няздатнасьць і рашала:

З мяне ня выдзе нічога. Прыдзецца вяртацца да хаты.

Але дзень перайшоў не ўзаметку. Зусім не прадоўжыўся. Да абеду сяк-так, а ад абеду—толькі мігнуўся.

Некалькі разоў прайшоў майстар, паглядзеў, ухмыльнуўся й нічога не сказаў—Прузына заўважыла.

Мыючы рукі на адходзе—лягчэй уздыхнула.

— Ну, як, цяжка працаваць?

Юзя таварыскі ўсьміхнулася.

Прузына адказала тым-жа.

— Цяжка. Ня здатна я, мабыць.

— Чаму?

З рук валіцца.

— Прывыкнеш...

І далей:

— Думаеш пра дом?

Прузына змаўчала.

І маўкліва некалькі дзён засаб хадзіла на фабрыку, пунктуальна; прыглядалася да работы, сачыла за ўсімі і за сабою. Практыкавала свой спрыт.

І адмячала—

Пасьпявала.

На трэці дзень пахвалілася Юзі:

— А ўсё-ж, не сьвятыя гаршкі лепець—справа наладжваецца.

Праз тыдзень была блізка да сталасьці ў данай працы. Фабрыка—прыблізілася да яе, работніцы й рабочыя—сталі сваімі. Тыя, з якімі спатыкалася на сходах—бяз усякае цырымоні сталі знаёмымі, віталіся, падыходзілі і вялі гутаркі.

Прузына не магла ўсачыць, як уверана абставіны працы захапілі яе цалкам, зрадніліе з новымі ўмовамі жыцьця, з новымі людзьмі. Не падмеціла, як вырасла запатрабаваньне да клюбу, да сходаў ячэек, да мітынгаў. Не заўважыла, як перарадзіліся пагляды на сьвет, на здарэньні; як перавя рнуліся прыхільнасьць і агіднасьць, як паўсталі новыя імкненьні. Самі сабою зьніклі асьцярога, нерашучасьць, чужасьць людзей, нажытая дома адмоўнасьць да бальшавікоў.

Жыцьцё фабрычных работніц; іх дбаньне пра вёску, іх стараньне павялічыць выпрацавалі з Прузыны заядлага абаронцу, прыхільніка супольнасьці, шчырых адносін да свае, работнічае місыі.

— Ведаеш, Юзечка,—казала Прузына таварышцы:—а я думала, што тут, у горадзе, жывуць на кошт вёскі, што рабочыя мала працуюць і многа зарабляюць. Нават цябе западозрывала ў гэтым... Сапраўды... Вядома, мала чаго набаюць у вёсцы ліхія людзі...

Юзя сьмяялася.

— А вось, каб не напісала, ня прыехалабы... А цяпер—і ў комуністыя запішу. Ха-ха-ха! Не баішся?

— Яшчэ пытаеш?

Быванье ў клюбе амаль ня што вечар, зацікаўленасьць сходамі і лекцыямі—зрабілі тое, што Прузына праз дзьве нядзелі запісалася ў гурток вывучэньня палітграматы, які наведвала пэўней за ўсіх.

Варочалася дамоў і гадзінамі мянялася думкамі з Юзяю.

— Трэба пісаць дзяўчатам,—казала яна:—што дарэмна іх зводзяць рознымі плёткамі пра горад, пра жыцьцё рабочых. Бяз нас—не абысьціся вёсцы...

Думка напісаць ліст у вёску, у якім-бы да дробкі асьвятліць перад вёскаю працу гарадзкіх рабочых, ячэек, партыі, саюзаў; у якімбы паказаць усю значнасьць тае работы па адбудове краю, якая відна больш усяго ў горадзе,—думка гэта захапіла Прузыну да шчэнту, праняла яе, і яна ўжо на трэцім тыдні свайго жыцьця ў горадзе пісала Тэклі ды Еве:

„Як мы многа страцілі, што былі ў баку ад усяго. Жылі, як обываталі, нічым ня цікавіліся, карміліся плёткамі на рабочых, на камуністых. Усякае думалі. А трэба пабачыць, як жывуць рабочыя, як працуюць і як горача дбаюць пра сялян ды пра вёску. Я ўсё гэта перажыла за гэтыя тры тыдні і, ведаеце, як зьмянілася. Мяне цягне да клюбу, да сходаў, да лекцый. Я хаджу на пасяджэньні ячэек. І думаю пра вас, сястрыцы. Думаю і кажу: запісвайцеся ў жаночыя аддзелы, прымайце ўдзел у савецкім будаўніцтве. Пакіньце жыць у баку ад усяго, сваім будзёным жыцьцём. Помніце, як мы сьмяяліся з Юзі? Можа вы й з мяне так пасьмеяцёся, прачытаўшы гэты ліст, але дармо. Часам і сьмех да дабра прыводзіць"...

Ліст прачытала Юзі.

— Падпішы.

Тая прыставіла свае прозьвішча.

— Гінуць нашы дзяўчаты, трэба да вёскі нам ехаць.

— Так, можа й так...

— Юзечка, праўду кажу: трэба ехаць, трэба. Нам з табою першым...

Задумаліся. Цэлы вечар прадумалі.

І пастанавілі:

— Праз месяц наведаць вёску.

Пятнанцатага жніўня вёска Канцы—фэставала. Процьма народу наехала. Райком ня мог прапусьціць гэтага выпадку, і з ранку абвясьціў пра мітынг пры царкве. На другую гадзіну.

Трыбуна—пастаянная. І калі ў вурочны тэрмін сакратар райкому перад тысячаю народу распачаў мітынг, да трыбуны прабіліся двое дзяўчат, у запыленых жакетках, загарэўшых, бойкіх.

Адна падала запіску, просечы слова.

Сакратар кінуў паглядам і скараціў прамову.

— Слова даецца Прузыне Гапцы.

Просім!!!

Праз хвіліну Прузына ачулася на трыбуне, абвяла грамаду сьмелым увераным узрокам, памаўчала момант і загаварыла, рашуча і цьвёрда:

„Браты сяляне й сялянкі! Я толькі што з возу. Я прыехала з гораду—і прывязла вам шчырае прывітаньне ад сотняў нашых таварышаў рабочых"...

Зычнае—„гура" праняслося вёскаю...

Прагудзела далёка за ёю. І разам—змоўкла.

Грамада прытаілася: што скажа дзяўчына далей?

І ціха-ціха, лёгкім шэптам канцоўцы перадавалі адзін другому:

— Гэта-ж Міхасёва Прузына?!

І яшчэ пільней настарожваліся, не спускаючы вачу з трыбуны.

— Што скажа дзяўчына?

Цішка Гартны.

Сялянка ў сельсаветах і камітэтах узаемадапамогі.

Практычная праца сялянак у сельсаветах і камітэтах узаемадапамогі.

„Справа Савецкай улады будзе даведзена да канца толькі тады, калі ў ёй прымуць удзел мільёны і мільёны працуючых жанчын".

Ленін.

Скончыліся на Беларусі перавыбары сельскіх саветаў і камітэтаў ўзаемадапамогі. Сельсаветы і камітэты ўзаемадапамогі, гэта арганізацыя бедняцкай і серадняцкай часткі сяла—супроць кулака.

Кожны год расьце ўдзел сялянак у савецкім будаўніцтве, расьце і мацнее лік новых буданікоў за паляпшэньне сельскай гаспадаркі, за адбуваньне зруйнаванай на вёсцы школы, за зьнішчэньне цеманты і несьвядомасьці сярод вялізнай масы вёскі,—расьце сьвядомасьць і актыўнасьць сялян. У гэтай важнай працы дагэтуль сялянка прыймала вельмі невялікі ўдзел. Цяжка было сялянку ў першыя гады прывабіць да грамадзкасьці. „Сходы і канфэрэнцыі, казала яна, справа ня бабскага розуму"; ды й вёска наогул крыва глядзела на бабу,—„У бабы волас доўгі, ды розум кароткі".

Сялянка—ў савецкім будаўніцтве.

Павольна вызвалялася сялянка з-пад ўплыву старых перажыткаў і паступова пачынала ўцягвацца у грамадзскае жыцьцё. Праз гэта ў першыя гады быў незначны процант сялянак у сельсаветах і камітэтах узаемадапамогі.

У 1923 годзе па ўсей Беларусі на кожныя 3 сельсаветы было па аднэй сялянцы: яшчэ менш было сялянак у камітэтах узаемадапамогі.

У зьвязку с тым Камуністычная партыя і Савецкая ўлада Беларусі паставілі перад сабой задачу, каб у 1924 годзе, ня менш як 20 процантаў, членаў сельсаветаў і камітэтаў узаемадапамогі—павінны быць сялянкі.

Поўнага падлічэньня вынікаў перавыбараў яшчэ няма, але па тым данным, якія маюцца,—прыблізна у кожным сельсавеце маецца ня менш 2-х сялянак; такім чынам сялянка у параўнаньні з прошлым годам заваявала сабе месц у шэсьць раз больш у савецкім будаўніцтве.

Але-ж справа ня толькі ў тым, каб быць членам сельсавета ці камітэта ўзаемадапамогі; справа ў працы.

Праца сялянкі ў сельсаветах і камітэтах узаемадапамогі.

Сялянка член сельсавета ці камітэта ўзаемадапамогі павінна памятаць, што на вёсцы непачаты край працы.

Часта сялянка скардзіцца на свой сельсавет, на неправідловую яго працу, на тое, што ён крыўдзе беднячак і г. д. Сялянка член сельсавета павінна адсунуць гэтыя недахваткі, палепшыць працу сельсавета ва ўсіх галінах яе.

У адбудаваньні сельскай гаспадаркі сялянка павінна быць зацікаўлена ня менш мужчыны, бо яна фактычна вядзе ўсю гаспадарку на вёсцы.

Будуйце дзіцячыя установы.

Аснаўное ў жыцьці працуючых—сваечасова вывучыць маладое пакаленьне грамаце. Дзеля гэтага не павінна быць ні воднай вёскі бяз школы. Падлічваючы усё значэньне школы на вёсцы, сялянка працуючы ў сельсавеце, павінна дапамагчы савецкай ўладзе адбудаваць школу.

Цяжка прыходзіцца сялянцы ў летні час пакідаць сваіх дзяцей без дагляду. Палявыя ясьлі аблягчаюць яе клопаты. Баялась раней сялянка ясель, як агня; цяпер яна ўжо разумее значэньне ясель для яе вызваленьня. Ясель у вёсцы па ўсей Беларусі было толькі 14. Гэту лічбу неабходна павялічыць. Трэба пастарацца каб ня толькі у кожным вокругу, ня толькі ў кожным райёне, але ў кожнай вёсцы былі ясьлі. Сялянка, працуючы ў сельсавеце павінна узяцца за арганізацыю ясель.

Праследвайце самагоншчыкаў і знахароў.

А самогон,—колькі траціць ён дарма хлеба, колькі ён зруйновывае сялянскіх сем'яў, колькі ён ўносіць жабрацтва. Барацьба з самагонам таксама справа сялянкі і ў першую чаргу сялянкі—члена сельсавета. Праз саветы яна будзе магчы адкрыць самагоншчыка і перадаць яго ў рукі народнага суда.

Знахарства ўносіць ў магілу прадчасна не адзін дзесятак маладых жыцьцёў. Сялянка член сельсавета павінна вясьці шырокую агітацыю сярод несьвядомай масы сялянак, каб яны не зьвярталіся да знахарак за радамі, а да ўрачоў, фэльдшараў і іншага мэдыцынскага пэрсаналю.

Памагайце хаце-чытальні.

Хата-чытальня — месца, адкуль сялянка можа чэрпаць новыя знаньні, месца, дзе сялянка можа вучыцца працаваць дзеля сваёй пралетарскай дзяржавы. Тут сялянка член сельсавета павінна праводзіць свой вольны час ад працы і прывабіць сюды яшчэ несьвядомую сялянку. Калі няма яшчэ у вёсцы хаты-чытальні, сялянка-член сельсавета павінна паклапаціцца і дапамагчы адчыніць яе.

Тварыце новы быт.

Пытаньні новага быту, стварэньне новай сям'і пранікаюць і ў вёску. Дзесяткі чырвоных хрэсьбін, чырвоных вясельляў ужо праводзіцца ў вёсцы. Сялянка член сельсавета павінна быць правадніком і прыхільнікам ўсяго гэтага на вёсцы.

Праца ў судзе, коопэрацыі і камітэце узаемадапамогі.

У працы пролетарскага суда і зямельных камісій асабліва па забясьпечаньню дзіцяці,—разводам,—сямейным падзелам,—падзелам зямлі і іншае павінна прымаць самы актыўны удзел сялянка—член сельсавета.

Адно з галоўных мейсц павінна занімаць сялянка-член сельсавета ў працы мясцовага коопэратыва.

Хто так блізка ведае патрэбы вёскі, патрэбы сялянак адзінотных, як не сялянка. Сялянка працуючы у камітэце ўзаемадапамогі павінна сачыць за правідловым разьмеркаваньнем насённых і грашовых пазычак, за разьмеркаваньнем зямлі незаможнаму сялянству і г. д.

У кожным савецкім органе, у кожнай камісіі на вёсцы павінна быць бачнае вока сялянкі, працуючай у вясковых грамадзскіх установах.

Вось, якія задачы высунулі Камуністычная партыя і Савецкая ўлада перад сялянкай прымаючай удзел у Савецкім будаўніцтве.

З'езды сялянак.

Дзеля таго, каб сялянкі, працуючыя ў сельсаветах, райвыканкомах, камітэтах узаемадапамогі і інш. савецка-грамадзкіх установах, больш падрабязна азнаёміліся з задачамі ў іх працы, з значэньнем гэтай працы, Камуністычная партыя Беларусі склікае 25 сьнежня гэтага году Ўсебеларускі зьезд сялянак, працуючых у грамадзкіх установах вёскі, а таксама паасобныя акруговыя і райёныя конфэрэнцыі на месцах.

Гэтыя конфэрэнцыі і зьезд абхопяць усю масу сялянак працуючых у вясковых грамадзкіх установах і дадуць ім правідловы напрамак у іх будучай адказнай працы.

Е. Кантаровіч.

Сялянкі разам з беднякамі.

(Старадарожны райён, Слуцкай акругі)

У Нова-Дарожным сельсавеце сабраліся сяляне і сялянкі на сход дзеля перавыбараў сельсавету. У клюбе сабраўшыеся разьбіліся на дзьве групы: ў ваднэй кулакі,—у другой беднякі і ўсе сялянкі. Калі дайшло да галасаваньня старшыні сельсавету, члена ЛКСМ, то бедняки і сялянкі ня бачучы на вялікія перашкоды кулакоў, усёж выбралі яго.

У часе галасаваньня былі чутны голасы сялянак: „Падымайце, мужчыны, рукі, ён харошы, справядлівы, абараняючы інтарэсы беднякоў". У сельсавет выбралі таксама двух жанчын—сялянак; адна сялянка выбрана ў камітэт узаемадапамогі. Трэба адзначыць, што ў ва ўсе сельсаветы Старадарожнага райёна прайшлі сялянкі.

Дашкоўская.

Як прайшлі перавыбары сельсаветаў і камітэтаў узаемадапамогі у Бабруйскім вокругу.

Страката газэта „Коммунист“ ад заметак з вёсак, у якіх гаворыцца дзе і колькі выбрана ў сельсаветы, камітэты ўзаемадапамогі, сялянак, батрачак і членаў КСМ. Няма ніводнага сельсавету, каб 2-3, а часам і 4 сялянкі не прайшлі-бы ў сельсаветы і камітэты узаемадапамогі.

Калі ў 1923 годзе налічвалася ў сельсаветах і камітэтах узаемадапамогі у нашым вокругу ўсяго 56 сялянак, то ў гэтым годзе мы маем 300 сялянак у сельсаветах і каля 150 у камітэтах узаемадапамогі. Гэты вялізарны процант ўзросту ўдзела сялянак у камітэтах у гэтым годзе кажа нам тое, што сялянін пачаў разумець права сялянкі і здольнасьць яе да грамадзкой працы. Амаль не на ўсіх сходах галасавалі аднагалосна за сялянку ў сельсаветы і камітэты ўзаемадапамогі.

— „Няхай-жа і баба будзе ў сельсавеце. Няхай і яна трохі папрацуе“. Гэта агульная думка нашых барадачоў вёскі. Наш селянін на восьмым годзе рэвалюцыі даручыў бабе працу ў сельсавеце, й камітэце ўзаемадапогі. Задача сялянак выпаўніць гэта даручэньне.

Наздроўская.

Трэба і баб у саветы.

Яшчэ з дзесятай гадзіны пачалі зьбірацца сяляне з далёкіх вёсак сельсавета; хто пехатой з краюхай хлеба пад пашкай, хто на кані; да дванаццатай гадзіны дня вялікі школьны будынак поўны да адказу. Расьселіся сяляне на школьных лаўках, а памеж імі групкамі ў 3-5 чалавек разьмясьціліся сялянкі. У вадным куту сабралася сялянак да 30. Абкружылі прадстаўніцу жанаддзела, гутараць аб парадках, камітэте узаемадапамогі, газэтах.

А ў другім куту каля печкі сабраліся сяляне.

— Во, чаго ніколі ня бывала,—бабы прыйшлі на выбары, чутно там.

